# Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай

# План.

1. **Лівонская вайна, палітычная сітуацыя у ВКЛ у першай палове 16 ст.**
2. **Лівонская вайна. Прычыны утварэння Рэчы Паспалітай.**
3. **Люблінскі сойм і умовы уніі.**
4. **Гістарычнае значэнне утварэння Рэчы Паспалітай.**

# Літаратура


- Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі. Дапаможнік. Выд.2 -  Мінск, 2005.
- Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Мінск, 1994 – 1995.
- Ермаловіч М.І. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае. – Мінск, 2000.
- Кітурка І.Ф. Гісторыя Беларусі.Дапаможнік. – Гродна, 2007.
- Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.- Мінск, 2001.

- Канец 15 – пачатак 16 ст. – абвастэнне унутрыпалітычнай сітуацыі ў ВКЛ.

- Самае вострае пытанне – канфессійнае – мятеж М. Глінскага 1508 г., у якім Глінскі зрабіў стаўку на праваслаўных федалаў. Яго падтрымаў маскоўскі князь Васіль ІІІ. І хаця мяцеж быў падаўлены, а яго удзельнікі жорстка пакараны, ен яшчэ раз паказаў небяспечнасць дысідэнтскага пытання.

# Знешнепалітычнае становішча

- У першай палове 16 ст. небяспеку для ВКЛ прадстаўлялі крымскія татары. Каб адкупіцца ад іх набегаў ВКЛ выплочвала Крымскаму ханству ардыншчыну, аднак
- 1502 г. – войска ВКЛ разбіла татар на р. Уша
- 1503 г.  - войска ВКЛ разбіла татар каля Давыд-Гарадка
- 1506 г. – Міхал Глінскі разбіў татар пад Клецкам
- Усяго за першую палову 16 ст. крымскія татары здзейснілі каля 50 набегаў на землі ВКЛ

## Адносіны з Маскоўскай дзяржавай

- Ваенна-палітычная барацьба за дамінаванне ва Усходняй Еўропе
- З канца 15 ст. Масква абвесціла сябе заступнікам усіх праваслаўных хрысціян ва Усходняй Еўропе.
- У 8-90-я г. 15 с. на бок маскоўскай дзяржавы перайшло шмат праваслаўных феадалаў
- Пачатак 16 ст. – прамое супрацьстаянне Масквы і Вільні.
- 1500 – 1503 г.г., 1507 – 1508 г.г., 1512 – 1522 гг., 1534 – 1537 гг. – памежныя войны з Масквой, па выніках якіх ВКЛ страціла Смаленск.

# Лівонская вайна 1558-1583 гг.



# Лівонская вайна

- Вайна Масковіі за выхад да Балтыйскага мора
- Лівонія – канфедэрацыя 5 духоўна-феадальных княстваў, якія намінальна лічыліся пад уладай рымскага папы і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. Лівонія звярнулася за дапамогай да ВКЛ, у 1561 Жыгімонт Другі Аўгуст узяў Лівонію пад свій пратэктарат, у адказ Масковія пачала вайну супраць ВКЛ.

## Ваенныя дзеянні

- Вясна-лета 1562 г. – войскі Івана Жахлівага асадзілі Дуброўна, Мсціслаўль, Оршу, Копысь, Шклоў, Оршу, Віцебск, Прапойск, іх саюзнікі  крымскія татары разрабавалі Рагачоў
- 15 лютага 1563 г. – войскі Івана Жахлівага пасля асады узялі Полацк
- 26 студзеня 1564 г. - войскі гетмана М. Радзівіла разбілі маскоўскія войскі на Чашніцкіх палях каля м. Ула
- Люты 1564 г. – войскі ВКЛ разбілі маскоўскае войска каля Оршы
- 1564 г. – маскоўскія войскі зноў асадзілі Мсціслаўль, Оршу, воскі ВКЛ здейснілі рэйд пад Вялікія Лукі і Смаленск

- Ліпень 1567 г. – войскі ВКЛ на чале з гетманам Раманам Сангушкай атрымалі перамогу пад Чашнікамі над маскоўскімі войскамі
- Верасень 1567 г. Р.Сангушка разбілі маскоўскія войскі і узялі урэпасць Ула
- Верасень 1568 г.- віцебскія казакі на чале з Біруляй адбілі у маскоўскіх войск Усвяты і Вележ
- 1576 г. – рускія войскі занялі Гомель, Юрый Радзівіл зноў вярнуў яго ў склад ВКЛ
- 4-30 жніўня 1579 г.- асада і і ўзяцце войскамі ВКЛ Полацка
- Восень 1589 г. – войскі Стефана Баторыя занялі гарады Усвят, Веліж, Вялікія Лукі, Холм, Старую Русу

- 1580 г. – рускія войскі занялі Магілеў
- 15 студзеня 1582 г. – Ям-Запольскае перамір’е на 10 гадоў, па яго умовам Расія адмаўлялася ад Лівоніі, Полацка, Веліжа, Невеля, Рэч Паспалітая вяртала Расіі гарады,занятыя на яе тэрыторыі – фактычнае завяршэнне Лівонскай вайны.

## У заключэнні уніі былі зацікаўлены абодва бакі

- ✔ ВКЛ была неабходна ваенная дапамога, шляхта ВКЛ імкнулася да “залатых шляхецкіх вольнасей” (ліберум вета, права на рокаш і канфедэрацыі)
- ✔ Польская шляхта жадала далучыць ВКЛ да Польшчы, атрымаць новыя землі і пасады
- ✔ Каталіцкая царква імкнулася пашырыць свій уплыў на ўсходнія землі

# Люблінскій сойм

- Працаваў з 10 студзеня па 1 ліпеня 1569 г.
- На перамовах бакі выступалі за розныя ўмовы злучэння Кароны і ВКЛ. Ліцвіны хацелі абмежавацца ваенна-палітычным саюзам і захаваць самастойнасць княства, Карона імкнулася скасаваць незалежнасць ВКЛ.
- З’езд быў прызначаны ў Любліне на 23 снежня 1568 г. Аднак паслы ВКЛ не спяшаліся і прыехалі ў Люблін толькі 10 студеня 1569 г. Сярод іх былі канцлер Мікалай Радзівіл Руды, падканцлер Еўстафій Валовіч, жамойцкі стараста Ян Хадкевіч

- Усяго на сойм прыбылі кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст і 160 паслоў.
- Пермовы цягнуліся 6 месяцаў, у ноч на 1 сакавіка паслы ВКЛ у знак пратэсту пакінулі Люблін.
- У адказ Жыгімонт II Аўгуст у сакавіку 1569 года выдае два універсалы і далучае да Кароны Падолле, Падляшша, Валынь і Кіеўшчыну. Жыгімонт загадаў паслам ВКЛ вярнуцца і падпісаць унію.

Ян Геранім Хадкевіч 27 чэрвеня 1569 года казаў:

**“Як усе гэта балюча, немагчыма выказаць словамі. Таму што мы абавязаны нашай Айчыне, як верныя сыны яе, клапаціцца аб яе дабрабыце столькі, колькі у нас есць моцы. Мы Айчыну нашу, якую сваей крывею ды жыццямі захавалі, абаранялі тут столькі, колькі маглі. Але тое, што мы не здолелі давершыць гэтай абароны, дык няхай гэта будзе прыпісана перашкодам, лесу і часу. Нам даводзіцца саступіць”. Ен заклікаў Жыгімонта Аўгуста “так правесці гэтую справу, каб княства не было ўз’яднана з няволяю і пасрамленнем нашым і нашчадкаў нашых…Мы ўжо дайшлі да таго, што павінны кінуцца з нізкаю нашаю просьбаю да ног вашай каралеўскай міласці. Молім, каб гэта для ўсіх было з гонарам.”**

## Мікалай Радзівіл Руды, віленскі ваявода:

"на нашым хрыбце быў вораг, калі мы ехалі сюды, жадаючы пастанавіць з вамі унію, якая б аб'яднала нас узаемнаю любоўю. І калі казаць праўду, мы пачалі імкнуцца да яе амаль бегам, тады як продкі нашыя шлі да уніі вельмі паціху"

- 1 ліпеня 1569 г. у Любліне быў падпісаны акт уніі і утварылася новая федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая



# Умовы уніі

## Агульнае

- Сойм, які збіраўся толькі на тэрыторыі Польшчы
- Кіраўнік дзяржавы
- Заканадаўства
- Агульная знешняя палітыка

## Асобнае

- Афіцыйная назва дзяржаў
- Адміністрацыйны апарат
- Судовая сістэма
- Войска
- Атрыбуты дзяржавы
- мова

# Палітычны лад Рэчы Паспалітай

Права ліберум вета.






1 - ГЕРЦОГСТВО ПРУССИЯ
(в составе Польши до 1657–1660)

2 - ПОДОЛИЯ (влад. Османской имп. с 1672)

Речь Посполитая. 1572 г.

Жыгімонт ІІ Аўгуст быў апошнім спадчынным каралем Рэчы Паспалітай.

Пасля яго смерці спынілася дынастыя Ягелонаў, якая правіла Польшчай  і ВКЛ з Крэўскай уніі 1385 г.



# Пасля уніі ў ВКЛ яе умовы не выконваліся

- 1573 г. – паслы ВКЛ дамовіліся, што усе даходы з украінскіх зямель павінны ісці ў казну ВКЛ;
- Была уведзена асобная прысяга караля для ВКЛ;
- Перад Вальным соймам прадстаўнікі ВКЛ збіраліся ў Ваўкавыску ці Слоніме, каб вызначыць пазіцыі;
- Існавала Віленская канвакацыя – асобныя шляхецкія з’езды ў Вільні, дзе вырашаліся пытанні развіцця ВКЛ;
- 1581 г. – утвораны Галоўны Трыбунал ВКЛ;
- 1588 г. – Статут ВКЛ, дзе нават няма прыгадвання пра Люблінскую унію

# Першы выбарны кароль РП

Генрых Валуа – апошні з дынастыі Валуа. Легкадумны, самазакаханы, ен быў абсалютна абыякавы да дзяржаўных спраў, не ведаў ні польскай, ні беларускай, ні лацінскай моў. Хаця да канца жыцця карыстаўся тытулам караля польскага і вялікага князя літоўскага



Быў уладаром РП  з лютага па ліпень 1574 г. Калі даведаўся пра смерць Карла IX, збег у Парыж, каб заняць каралеўскі трон. Быў забіты дамініканскім манахам у час асады Парыжа войскамі гугенотаў.



Генрых Валуа падпісаў Pacta canventa – абавязкі караля перад Рэччу Паспалітай

Генрыхавы артыкулы – дакумент, на якім прысягалі польскія каралі

- Свабоднае абранне караля шляхтай
- Кароль без згоды сойма не мог склікаць паспалітае рушанне і увесці новыя падаткі
- Шляхта мела права на канфедэрацыі і рокаш



Кіраваў РП у 1576-1586 г., другі выбарны кароль РП.

Пра яго гісторык І. Пасторый казаў: “Ён быў у касцеле больш, чым святар, у рэспубліке больш чым сенатар, у судзе больш чым адвакат, у войску больш, чым гетман, у баі больш чым салдат, а ў перанясені непрыемнасцей, у цярплівасці, дабраце і прабачэнні асабістых абраз – больш, чым чалавек”.

Венгр, скончыў Падуанскі універсітэт, валодаў нямецкай, лацінскай, італьянскай мовамі, аднак польскай мовы не ведаў, размаўляў з падданымі на лацінскай праз перакладчыка.

Стэфан Баторый



Стефан Баторий

- 30 жніўня 1579 г. вызваліў Полацк
- 15 студзеня 1582 г. – падпісаў з Іванам Жахлівым Ям-Запольскі мірны дагавор на 10 год.
- Падтрымліваў каталіцкую царкву і езуітаў. Прывілеем ад 1 красавіка 1579 г. пераўтварыў Віленскі езуцкі калегіум ў Акадэмію.
- Вельмі любіў Гародню, трымаў там рэзідэнцыю, перабудаваў Стары замак
- 14 снежня 1586 г. у Гародне было праведзена першае на тэррыторыі Усходняй Еўропы анатаміраванне.
- Астанкі Баторыя 1,5 гады знаходзіліся ў Фарным касцеле Гродна, потым насупярак яго запавету, былі перазахаваны ў Вавельскім замку Кракава



Стефан Баторий

# Асноўныя накірункі знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай ў 17 -18 ст.

- **Супрацьдзеянне Рэчы Паспалітай татарскай, шведскай і турэцкай агрэсіі**
- **Канфрантацыя Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай**

# Рэч Паспалітая ў 16 ст.



# Рэч Паспалітая ў пярыяд росквіту



- У канцы XVI ст., пасля перамогі ў Лівонскай вайне, знешнепалітычныя пазіцыі Рэчы Паспалітай здаваліся вельмі моцнымі. Яна была адной з дзяржаў, якая сапернічала з Габсбургамі за лідэрства ў Цэнтральнай Еўропе. Распачатая ў 1609 г. адкрытая ваенная інтэрвенцыя супраць Расіі прывяла да далучэння Смаленска і Чарнігава-Северскіх зямель да Рэчы Паспалітай. Кіраўніцтву Рэчы Паспалітай удалося вырашыць і праблему татарскіх нападаў. Яшчэ Жыгімонт II падчас Лівонскай вайны прыняў на дзяржаўную службу (уключыў у рэестр) частку казацкай вольніцы.



Запорожская Сечь. Реконструкция

- Князь Д. Вішнявецкі, буйны магнат на Украіне, **пабудаваў на востраве на Дняпры крэпасць - Запарожскую Сеч**, дзе пасяліў ваяўнічыя казацкія атрады. Такім чынам, разрозненыя казацкія групоўкі, якія раней вялі ў стэпе абарончую, партызанскую вайну супраць Крымскага ханства, пераўтварыліся ў добра арганізаванае, прафесійнае войска. Казакі перакрылі татарскім ордам шлях на Украіну і Беларусь. Крымскае ханства цяпер магло пагражаць Рэчы Паспалітай толькі ў саюзе з Турцыяй альбо Расіяй.



Запорожская Сечь. Реконструкция

- Больш складаным былі справы на Балтыйскім узбярэжжы. Сын шведскага караля і польскай прынцэсы Жыгімонт Ваза ў 1588 г. стаў каралём Рэчы Паспалітай пад імем **Жыгімонта III**. Затым ён унаследаваў карону Швецыі, стаў шведскім каралём Жыгімонтам I. Але лютэранская апазіцыя ў Швецыі на сойме 1599 г. дэтранізавала яго. Жыгімонт III Ваза не збіраўся канчаткова губляць шведскую карону і пайшоў на вырашэнне спрэчак сілавым метадам. З 1602 г. пачаліся актыўныя ваенныя дзеянні. Новы шведскі кароль Карл IX быў двойчы разгромлены войскам вялікага гетмана ВКЛ Яна Караля Хадкевіча. Гэты трыумф праславіў гетмана на ўсю Еўропу, але радыкальных перамен у вайне не адбылося.



- Упартасць амбіцыйнага Вазы ў яго барацьбе за вяртанне шведскай кароны мела сумныя вынікі для Рэчы Паспалітай. У выніку вайны Швецыя ўмацавалася і стала дамінуючай дзяржавай Балтыкі.
- Чарговая вайна Швецыі ў саюзе з Брандэнбургам і Трансільваніяй супраць Рэчы Паспалітай **1655-1660 гг.**, перапляталася з вайной Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг. і вайной Расіі супраць Швецыі 1656-1661 гг.



Польский король Сигизмунд III

- Вайну пачаў шведскі кароль Карл X Густаў нападам на Польшчу ў ліпені 1655 г. Восенню ён заняў Варшаву, Кракаў і вымусіў капітуляваць каронную армію. Кароль Ян II Казімір выехаў у Сілезію. На працягу паўгода шведы захапілі амаль усю тэрыторыю Польшчы і Жамойць. Значная частка магнатаў, шляхты і арміі перайшлі на бок шведаў.
- Паражэнні Рэчы Паспалітай у войнах са Швецыяй і Расіяй падштурхнулі "сепаратысцкую" шляхецкую групоўку ВКЛ на чале з вялікім гетманам Янушам Радзівілам падпісаць **Кейданскі дагавор 1655 г.**, паводле якога ВКЛ парывала дзяржаўную унію з Польшчай і заключала яе са Швецыяй. Аднак большасць шляхты Беларусі не падтрымала гэтай ініцыятывы, і Рэч Паспалітая захавалася. У канцы года раптоўна памёр Я. Радзівіл.

- **"Патоп"**, як назавуць шведскае ўварванне, прывёў палякаў у шокавы стан. Аднак шок першых месяцаў змяніўся ўздымам патрыятычных пачуццяў. Акупацыя Польшчы шведамі выклікала шырокае народнае супраціўленне і партызанскую барацьбу, да якой далучылася і шляхта.
- Узнавіла ваенныя дзеянні польская армія і ў вайне настаў перапом. Галоўныя сілы Карла X Густава трапілі ў акружэнне ў сутоках рэк Сан і Вісла, а войска, што ішло яму на дапамогу, было разбіта пад Варнай. 1 ліпеня 1656 г. была вызвалена Варшава.

- Восенню шведскі кароль выступіў з першым праектам падзелу аслаблай Рэчы Паспалітай паміж Швецыяй, Брандэнбургам, Трансільваніяй, украінскімі казакамі і стрыечным братам Я. Радзівіла Багуславам, што пераўтварала Рэч Паспалітую з суб'екта міжнароднай палітыкі ў яе аб'ект. Праект прадугледжваў стварэнне незалежнага спадчыннага княства для Радзівіла, у якое павінна было ўвайсці Навагрудскае ваяводства і некаторыя родавыя ўладанні Радзівілаў. Аднак шведаў паступова выцяснялі з тэрыторыі Польшчы. На бок Рэчы Паспалітай прымкнуў імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Леапольд I і перайшоў прускі герцаг Фрыдрых Вільгельм. Смерць Карла X аблегчыла мірныя перагаворы, якія завяршыліся падпісаннем у 1660 г. **Аліўскага міру** (у Аліўскім кляштары пад Гданьскам) паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ян II Казімір адмовіўся ад прэтэнзій на шведскі трон. Рэч Паспалітая прызнала шведскія заваяванні на поўнач ад Дзвіны - у Ліфляндыі і Эстоніі. Курляндскае і Земгальскае княствы і Інфлянцкае ваяводства засталіся ў Рэчы Паспалітай як сумеснае валоданне Польшчы і ВКЛ.

- На бок Рэчы Паспалітай прымкнуў імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Леапольд I і перайшоў прускі герцаг Фрыдрых Вільгельм. Смерць Карла X аблегчыла мірныя перагаворы, якія завяршыліся падпісаннем у 1660 г. **Аліўскага міру** (у Аліўскім кляштары пад Гданьскам) паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ян II Казімір адмовіўся ад прэтэнзій на шведскі трон. Рэч Паспалітая прызнала шведскія заваяванні на поўнач ад Дзвіны - у Ліфляндыі і Эстоніі. Курляндскае і Земгальскае княствы і Інфлянцкае ваяводства засталіся ў Рэчы Паспалітай як сумеснае валоданне Польшчы і ВКЛ.

- Доўгі час сур'ёзнай пагрозай для Еўропы была Асманская імперыя, якая ўзнікла ў ходзе заваявальных войнаў, што вяліся туркамі-асманамі пад ідэйным ісламскім сцягам "барацьбітоў за сапраўдную веру супраць няверных" і да пачатку XVI ст. ператварылася ў мацнейшую сусветную дзяржаву. Вайна, асабліва з немусульманамі, лічылася нормай не толькі з пункту погляду яе права, але і складала аснову існавання ваенізаванай Асманскай дзяржавы. У XVI ст. яна валодала вялізнымі тэрыторыямі ў Еўропе (Балканскі паўвостраў і Крым), Азіі (Малая Азія, Аравія, Міжрэчча, Сірыя, Палесціна, Закаўказзе) і Паўночнай Афрыцы і вылучалася вайсковай магутнасцю.




1 - ГЕРЦОГСТВО ПРУССИЯ (в составе Польши до 1657–1660)
2 - ПОДОЛИЯ (влад. Османской имп. с 1672)

Речь Посполитая. 1572 г.

- Асманская імперыя стала непасрэдна пагражаць Цэнтральнай і Заходняй Еўропе, аж да 70-х гг. XVII ст. ажыццяўляла заваёўніцкія паходы, у тым ліку і на землі Рэчы Паспалітай. Толькі к канцу стагоддзя Еўропа змагла перайсці ў контрнаступленне.
- Ужо ў пачатку XVI ст. для еўрапейскіх дзяржаў стаў відавочным той факт, што ніводная з іх не валодае дастатковым патэнцыялам дзеля таго, каб у адзіночку справіцца з асманскай агрэсіяй. Каралі з дынастыі Ягелонаў звярталіся да еўрапейскай супольнасці за дапамогай супраць турак.




1 - ГЕРЦОГСТВО ПРУССИЯ (в составе Польши до 1657–1660)
2 - ПОДОЛИЯ (влад. Османской имп. с 1672)

Речь Посполитая. 1572 г.

- Між тым адносіны з Турцыяй складваліся для Варшавы трывожна. У 1620 г. праз рабаўнічыя напады казакоў на турэцкія ўладанні дайшло да адкрытага канфлікту Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй. У 1620 г. туркі ўварваліся на тэрыторыю Украіны. На другі год султан Асман II абяцаў спустошыць усю Рэч Паспалітую. **Толькі гераізм абаронцаў лагера пад Хоцінам на Днястры, дзе злучанымі сіламі да апошняй хвіліны жыцця кіраваў 60-гадовы літоўскі гетман Ян Кароль Хадкевіч,** скаваў велізарную турэцкую армію і дазволіў у кастрычніку 1621 г. заключыць з Портай мір



- Найбольш небяспечная вайна з асманамі адбылася ў канцы стагоддзя. У 1672 г. яны захапілі Камянец-Падольскі, дайшлі да Львова і Кракава. Варшаўскі ўрад у тым жа годзе падпісаў мір, паводле якога аддалі туркам амаль усю Украіну, абавязваліся штогод плаціць султану па 22 тыс. чырвоных злотых. Умовы былі ганебнымі. Сойм не ратыфікаваў гэтага дагавора, устанавіў высокі падатак, і на гэтыя грошы сабралі 50-тысячнае войска. 11 лістапада 1673 г. пад **Хоцінам** гетман **Ян Сабескі** разграміў турэцкую армію, аднак вярнуць страчаныя землі не ўдалося. Не было відаць і канца вайне. У 1675 г. турак ледзь адагналі ад Львова.



- У адзіночку адцясніць турак Рэч Паспалітая была не ў стане. У 1683 г. быў заключаны саюз с Габсбургамі, а хутка з аўстрыйскай сталіцы пачуліся заклікі аб дапамозе: Ян Сабескі, які быў ужо абраны каралём, прывёў да венскіх сцен 30-тысячную армію. Пад яго камандаванне перайшлі аўстрыйскія палкі і дапаможны корпус з нямецкіх княстваў. Маючы ў агульнай колькасці да 70 тыс. чалавек - трохі меней, чым праціўнік, - ён 12 верасня **1683 г.** даў генеральны бой. Разгром турак-асманаў пад Венай радыкальна змяніў абстаноўку на паўднёвым усходзе кантынента. Хоць Порта ўсё яшчэ заставалася грозным праціўнікам, асманскай экспансіі ў Еўропе быў пакладзены канец. Сабескі праславіўся на кантыненце як выратавальнік хрысціянскага свету ад няверных. Гэта быў апошні поспех Рэчы Паспалітай на міжнароднай арэне.



# Адносіны з Маскоўскай дзяржавай

- Пасля перамогі ў Лівонскай вайне 1558-1582 гг., знешнепалітычныя пазіцыі Рэчы Паспалітай сталі настолькі трывалымі, што дазволілі ёй самой перайсці да экспансіі на Усход.
- Восенню 1604 г. пры падтрымцы караля Жыгімонта III Вазы з тэрыторыі Украіны на Маскву выправіўся 3-тысячны атрад на чале з быццам бы цудам ацалелым сынам Івана Грознага царэвічам Дзмітрыем, які лічыўся забітым у 1591 г. **(Ілжэдзмітрыем I)**.



"Дмитрий Самозванец".
Гравюра Ф. Снядецкого. XVII в.

- У лагеры самазванца быў і невялікі аддзел літвінскай шляхты, хоць у цэлым шляхта ВКЛ адмоўна паставілася да гэтай авантуры. Пасля раптоўнай смерці цара Барыса Гадунова, пры падтрымцы маскоўскага баярства самазванец увайшоў у Маскву і быў каранаваны там на царства. Але праз год у Маскве выбухнула паўстанне. Паўстанцы расправіліся з Ілжэдзмітрыем і яго наймітамі.



"Дмитрий Самозванец". Гравюра Ф. Снядецкого. XVII в.



Марина Мнишек

- Праўрадавыя колы Рэчы Паспалітай пачалі прапагандаваць ідэю прэвентыўнай вайны. Вясной 1607 г. у Шклове з'явіўся другі самазванец, які з войскам авантурыстаў рушыў на Маскоўскае царства і ў пачатку 1608 г. ужо кантраляваў палову яго, але быў спынены арміяй Васіля Шуйскага ля самай сталіцы, у вёсцы Тушын.


Лжедмитрий II


Марина Мнишек

- Баярская апазіцыя ў Маскве, якая жадала пазбавіцца ад новага цара Васіля Шуйскага, патаемна прапанавала царскую карону сыну Жыгімонта III Уладзіславу. Насуперак волі вальнага сойма, Ваза ў 1609 г. распачаў адкрытую вайну супраць Расіі з мэтай адваявання Смаленскай зямлі і далучэння Маскоўскай дзяржавы да Рэчы Паспалітай у якасці члена федэрацыі. У верасні літвінска-польскае войска з каралём на чале ўзяло ў аблогу першакласную Смаленскую крэпасць.


С.В. Иванов. "В смутное время"

- Незадаволенае палітыкай Шуйскага маскоўскае баярства звергла цара. Часовы ўрад - баярская рада ("сямібаяршчына") накіравала да Жыгімонта пад Смаленск пасольства і ў жніўні 1610 г. заключыла з ім дагавор пра саюз Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай праз абранне царом 15-гадовага **каралевіча Уладзіслава, які быў афіцыйна абвешчаны царом Расіі**. У верасні 1610 г. польскае і літвінскае войскі занялі Маскву, а яшчэ праз год штурмам быў здабыты і вернуты ў склад ВКЛ Смаленск.



- Аднак у 1612 г. у Маскве выбухнула паўстанне супраць інтэрвентаў. У жніўні да сталіцы падышло расійскае апалчэнне, сфарміраванае ў Ніжнім Ноўгарадзе старастам Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім. Славуты літвінскі палкаводзец Ян Хадкевіч, які перамагаў і шведаў, і туркаў, тут пазнаў паражэнне. У лістападзе заціснуты ў Крамлі польска-літоўскі гарнізон капітуляваў.



А.Д.Кившенко.
Воззвание Кузьмы Минина к нижегородцам. 1611 г.

- Земскі сабор 1613 г. абраў царом 16-гадовага Міхаіла Раманава. У 1617-1618 гг. каралевіч Уладзіслаў сам узначаліў паход на Маскву, каб вярнуць трон, але яе штурм вынікаў не даў. Вычарпаныя баявыя рэсурсы і значныя страты ў людзях вымусілі абодва бакі пайсці на перагаворы. 1 снежня **1618 г. было падпісана Дэулінскае перамір'е** на 14,5 гадоў, паводле якога ў склад ВКЛ увайшлі Смаленск, Мажайск, Дарагабуж, Вязьма, да кароны - землі Чарнігаўская і Северская. Каралевіч Уладзіслаў захаваў тытул "цара маскоўскага і ўсяе Русі", але на троне застаўся Міхаіл Раманаў.



Михаил Федорович
(1596-1645)

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Урад цара Аляксея Міхайлавіча імкнуўся да рэваншу за інтэрвенцыю Рэчы Паспалітай на пачатку XVII ст. Зручную сітуацыю для нанясення вырашальнага ўдару па Рэчы Паспалітай стварыла вайна ўкраінскіх казакаў супраць Кароны, якая зацягнулася і знясіліла апошнюю. Перамовы аб удзеле Расіі ў вайне з Рэччу Паспалітай на баку Хмяльніцкага вяліся з 1649 г.
- На працягу 1649-1651 гг. маскоўскі ўрад, хоць і заяўляў аб гатоўнасці аказаць дапамогу ўкраінскім казакам, але не мог рашыцца на адкрытае ваеннае ўмяшанне на Украіне і ВКЛ. Расія яшчэ не была гатова да вайны.


Царь Алексей Михайлович

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- З сакавіка 1653 г. яна пачынае актыўна да яе рыхтавацца. Згода Земскага сабора 1653 г. аб прынятцці Украіны пад царскую "высокую руку" і абвяшчэнне гэтага рашэння на Пераяслаўскай Радзе 8 студзеня 1654 г. азначалі пачатак вайны



Царь Алексей Михайлович



Богдан Хмельницкий

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- У **мai 1654 г.** тры вялікія арміі - з Вялікіх Лук, Вязьмы і Бранска - агульнай колькасцю да 80 тысяч чалавек уварваліся ў межы ВКЛ. Ім на дапамогу Б. Хмяльніцкі паслаў з Украіны 20-тысячны атрад пад началам наказнога гетмана Івана Залатарэнкі, які павінен быў дзейнічаць у паўднёва-ўсходніх паветах Беларусі.
- Агульная задума рускага камандавання заключалася ў заняцці важных стратэгічных пунктаў на шляху да Вільні. На першым этапе вайны ВКЛ змагла выставіць супраць гэтай сілы 10-12-тысячнае апалчэнне мясцовай шляхты.





Царь Алексей Михайлович

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- За першы год вайны руская армія авалодала тэрыторыямі да Дняпра на ўсходзе і да Дзвіны на поўначы Беларусі. Смаленск, Віцебск і Гомель упарта адбіваліся.
- Шэраг гарадоў на пачатку вайны капітуляваў: Магілёў, Шклоў, Невель, Чавусы, Полацк. Некаторыя здаліся пад уплывам прапаганды беларускага шляхціча Канстанціна Паклонскага, які перайшоў на бок цара, стварыў мясцовы казацкі полк і меў даручэнне схіляць гарады да здачы.

## Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Рускія ваяводы знішчалі ўсё, што можна было знішчыць, бязлітасна распраўляліся з абаронцамі гарадоў, а сялян і асабліва рамеснікаў тысячамі вывозілі ў палон. У Маскве і іншых рускіх гарадах узніклі цэлыя слабодкі з гвалтоўна перасеЛеных туды "беларусцаў", як называлі ў Расіі ўсходніх літвінаў.
- Царызм выконваў ужываў тактыку “выпаленай зямлі”

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Расія ажыццяўляла праграму цара Аляскея Міхайлавіча: “Касцелам не быць (а маліцца ў дамах), уніятам не быць, жыдам не быць!” І зноў жа ставілася задача “воевать села и деревни, и хлеб, и сена жечь, и людей побивать, и в полон имать».



Царь Алексей Михайлович

## Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Вясной 1655 г. пачаўся другі паход рускай арміі, якая атрымала перамогі пад Барысавам, Слуцкам, Ашмянамі. У ліпені яна авалодала Менскам, Клецкам, Слонімам.
- 31 ліпеня амаль безабаронная Вільня была захоплена, абрабавана і выпалена, у жніўні ўзяты Гродна і Коўна. Да восені ўся тэрыторыя Беларусі апынулася пад акупацыяй, за выключэннем раёнаў Палесся, Берасцейшчыны і Панямоння. Слуцк, Пінск, Стары Быхаў і Брэст заставаліся пад кантролем польска-літоўскіх сіл.

## Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- 4 верасня Аляксей Міхайлавіч прыняў тытул самадзержца "всея Великия и Малыя и Белыя России".
- Пасля захопу Вільні маскоўскі ўрад палічыў ліквідацыю ВКЛ як дзяржавы і анексію яго зямель справай вырашанай і пайшоў на часовае прымірэнне з Рэччу Паспалітай.
- У 1656 г. у Немежы, пад Вільняй, паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай было падпісана двухгадовае перамір'е.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Гаспадаранне маскоўскіх войскаў на Беларусі, шматлікія паборы і кантрыбуцыі, рабаўніцтва, гвалт і масавы вываз людзей у няволю распальвала тут антырускія настроі і выклікала шырокі рух народнага супраціву (шышы). Ён пачаўся адразу пасля з'яўлення царскага войска ва ўсходніх паветах дзяржавы, актывізаваўся падчас наступальнай кампаніі гетмана Я. Радзівіла зімой 1654-1655 гг.
- Яго разгортванню ў 1657 г. у Мінскім ваяводстве і Падняпроўі садзейнічала прысутнасць казацкіх атрадаў **Івана Нячая**, прызначанага замест І. Залатарэнкі. У 1658 г. загоны Нячая сталі адкрыта ваяваць супраць расійскага войска.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Асаблівую незадаволенасць казацкіх старшынь выклікалі спробы царскіх ваяводаў прывесці "беларусаў да падданства цару".
- Калі на пачатку вайны, дзякуючы шырокай прапагандзе і ўдаламу выкарыстанню міжканфесійных супярэчнасцяў у ВКЛ маскоўскі ўрад змог у шмат якіх месцах Беларусі нейтралізаваць і нават схіліць на свой бок праваслаўнае насельніцтва, то з пачаткам акупацыі больш характэрна масавая антымаскоўская барацьба мясцовага насельніцтва.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Вясной 1660 г., пасля заключэння мірнага пагаднення са Швецыяй, Рэч Паспалітая змагла засяродзіць сілы на барацьбе з Масквой.
- З другой паловы 1660 г. ваенная ініцыятыва канчаткова пераходзіць у рукі польска-літоўскага камандавання. З Прусіі і Ліфляндыі да Вільні былі перакінуты войскі пад началам вялікага гетмана П. Сапегі і С. Чарнецкага.
- У 1661 г. сталіца ВКЛ была вызвалена. Рускія войскі не змаглі стрымаць націску і адступілі ў напрамку Полацка.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Абодва бакі былі знясілены ваеннымі дзеяннямі.
- Пасля працяглых і цяжкіх перамоў у **1667 г. у в. Андросава**, каля Мсціслава, паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай **было заключана пагадненне тэрмінам на 13,5 года**. Паводле яго ўмоў, Смаленскае і Чарнігаўскае ваяводствы і ўкраінскія землі па левы бераг Дняпра адыходзілі да Расіі. Тэрыторыя ВКЛ паменшылася з 370 да 312 тыс. кв. км.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Трактат, падпісаны ў беларускай вёсцы Андросава, стаўся найважнейшай падзеяй гісторыі Цэнтральна-Усходняй Еўропы. **Баланс сіл ва Усходняй Еўропе быў канчаткова парушаны на карысць Маскоўскай дзяржавы, якая выйшла на першае месца па магутнасці, заваладала ініцыятывай.**
- Рэч Паспалітая, наадварот, ужо ў Андросаве падпісала сабе прысуд. Прыйшоў час хуткага заняпаду Рэчы Паспалітай.



# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Да замірэння 1667 г. тут аднесліся па-рознаму. Частка магнатаў і шляхты ўхваляла яго. Групоўка сенатараў на чале з Янам Сабескім катэгарычна выступіла супраць Андросаўскага трактата і заклікала працягваць вайну.



## Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Шматгадовыя ваенныя дзеянні, палітыка татальнага спусташэння зямлі і вываду палонных прывялі Беларусь да дэмаграфічнай і гаспадарча-эканамічнай катастрофы, на стагоддзе адкінулі яе назад.
- **Па стратах і адмоўных выніках вайна 1654-1667 гг. была самай трагічнай у нашай гісторыі,** гэта нацыянальная катастрофа. З 1650 па 1667 гг. **колькасць насельніцтва скарацілася больш як удвая - з 2,9 да 1,4 млн. чалавек.**
- Спатрэбілася 125 гадоў, каб насельніцтва Беларусі дасягнула ўзроўню сярэдзіны XVII ст.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Беларускія ваяводствы абязлюдзелі таксама з-за перасяленняў, вывазу сялян і рамеснікаў ў Расію. Частку палонных прадавалі на рынках. Іх куплялі мусульманскія купцы і высылалі ў паўднева-усходнія краіны.
- Асабліва пацярпелі жыхары паветаў, сумежных з Маскоўскай дзяржавай. Тут пуставала ад 69 да 75 % хат, тут засталася меньш за трэць даваеннага насельніцтва.

## Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Беларусь уяўляла сабой суцэльнае папялішча. Дакументы сойма, які адбыўся ў Варшаве ў 1661 г. сведчылі: Гарадзенскі павет *“ператвораны ў руіны і ў большай часцы спалены”*, Браслаўскі *“ушчэнт зруйнаваны”*, Слонімскі *“амаль датла спалены і разрабаваны”.*
- Ад Гародні, як сведчыць чэшскі падарожнік, “толькі і засталося гарадское смецце”.
- У 1656 г. у Мінску жыло толькі 156 чалавек, а сам ен ляжаў у руінах.

## Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Соймавымі пастановамі 60-х гадоў 17 ст. 20 беларускіх гарадоў на чатыры гады былі вызвалены ад усіх дзяржаўных павіннасцей.
- У каралеўскай грамаце 1653 г. пісалі: ***“ У месцах і мястэчках нашых Вялікага княства Літоўскага бядноты такая вялікая моц множылася, што ўсе вуліцы і месцы імі запоўнены, адкуль немалая нагода да розных хвароб і заразы”.***
- Гэта прывяло да эпідэміі сыпнога тыфу, якая лютавала з 1653 па 1658 і успыхнула зноў ў 1664.

# Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654-1667 гг.

- Гарады і мястэкчі цярпелі не толькі ад разбурэнняў. Да крайняга збяднення даводзілі жыхароў пастоі войска і ваенныя паборы.
- Гарадское насельніцтва скарацілася на 55%. У Віцебску на канец вайны засталося 70 рамеснікаў, у Магілеве да вайны было больш 2 000 рамеснікаў, а ў 1745 – 95, у 1650 у Гародні працавала 130 рамеснікаў, а ў 1680 толькі 12.

- Ступень разбурэння ва Усходняй Беларусі была больш высокай, чым на Захадзе.
- У гістарычнай літаратуры зацвердзілася думка, што ад войнаў сярэдзіны 17 ст. больш стратаў панеслі каралеўскія і царкоўныя ўладанні, чым шляхецкія.
- Вайна быццам перайначыла ўсю Беларусь. Край добра развітай гаспадаркі, рамеснай вытворчасці, далека вядомы вырабамі сваіх майстроў, зусім запусцеў і стаў непрыкметнай ускраінай.

# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў



- У канцы XVII ст. на поўначы Еўропы склаліся эканамічныя і палітычныя перадумовы для перадзелу сфер уплыву паміж мацнейшымі дзяржавамі рэгіёну. Расія, Саксонія і Данія ўтварылі кааліцыю пад назвай "Паўночны саюз" (адсюль і назва вайны 1700-1721 гг.), паспрабавалі захапіць частку ўладанняў Швецыі.



- У жаданні вярнуць Лівонію, страчаную Рэччу Паспалітай паводле Аліўскага міру 1660 г. на карысць Швецыі, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аўгуст II, які быў адначасова і курфюрстам Саксоніі,
- **у 1700 г. у саюзе з Даніяй і Расіяй выступіў супраць Швецыі.** Расія ў Паўночнай вайне імкнулася заваяваць землі, якія былі захоплены Швецыяй у пачатку

# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў



- Вайна пачалася няўдала для саюзнікаў. Шведская армія з Карлам XII на чале ў 1700-1701 гг. прымусіла капітуляваць Данію, пад Нарвай атрымала перамогу над расійскай арміяй, пад Рыгай разбіла саксонскае войска Аўгуста II.
- У  пачатку 1702 г. уступіла на тэрыторыю ВКЛ. Беларусь стала арэнай ваенных дзеянняў. Падчас Паўночнай вайны ВКЛ, бадай, у апошні раз выступіла ў якасці самастойнага фактару еўрапейскай палітыкі.



# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў



- **У 1702-1703 гг. паміж княствам і Расіяй былі падпісаны тры міждзяржаўныя пагадненні аб сумесных дзеяннях супраць Швецыі.**
- Расія імкнулася выкарыстаць антышведскія настроі шляхты, каб уцягнуць Рэч Паспалітую ў вайну, надоўга затрымаць шведскія войскі на яе тэрыторыі, што дало б магчымасць самой лепш падрыхтавацца да вайны.
- Расійскі ўрад абяцаў ваенную і фінансавую дапамогу і нават распрацоўваў праект пераходу ВКЛ пад вярхоўную ўладу цара.



# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Грамадства ВКЛ раскалолася на праціўнікаў і прыхільнікаў шведаў. У гэты ж час у дзяржаве разгарэлася "магнацкая" вайна за ўладу паміж Сапегамі, Агінскімі, Вішнявецкімі і Радзівіламі.
- Сапегі шукалі падтрымку ў Карла XII, а прадстаўнікі антысапегаўскай шляхецкай партыі (Агінскія і Вішнявецкія) дамаўляліся з Пятром I.
- Прыклад палітычнай беспрынцыповасці паказаў кароль Аўгуст II. Ён кідаўся то да Пятра I, то да Карла XII. У імкненні заключыць сепаратны мір са Швецыяй ён не спыняўся нават перад магчымасцю частковага падзелу Рэчы Паспалітай.







# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Шведскі кароль лічыў Аўгуста II несумленным палітыкам і задумаў пазбавіць яго каралеўскай пасады. Кандыдата ў каралі шукалі нядоўга. У 1704 г. шляхта на чале з апальнымі Сапегамі, якая непрыязна ставілася да Аўгуста II, пры падтрымцы шведскіх штыкоў абрала новым манархам ваяводу Станіслава Ляшчынскага.
- У Рэчы Паспалітай утварылася двоеўладдзе: адны падтрымлівалі Аўгуста II, другія - Станіслава Ляшчынскага. Чарговая канфрантацыя вяла да трагедыі - прыцягнення знешніх сіл для вырашэння ўнутраных супярэчнасцяў.



# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Восенню 1704 г. у Беларусь уступіла амаль 60-тысячнае расійскае войска пад камандаваннем Рапніна, усе выдаткі па ўтрыманні яго неслі мясцовыя жыхары. Расійская армія ачысціла тэрыторыю ВКЛ ад шведскіх войскаў і атрадаў Сапегі. Шведы перайшлі Нёман, разбурылі ваколіцы Гародні.
- Па беларускай зямлі пачаў гуляць смерч спусташэння. Рэч Паспалітая ператварылася "ў заезджы двор і карчму" для чужаземных войскаў, якія зводзілі рахункі паміж сабою і нішчылі край.



## Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Вядомы загад Пятра I, паводле якога патрабавалася "... везде провиант и фураж, тако ж хлеб стоячий в поле и в гумнах или в житницах по деревням ... жечь, не жалея и строения ... уничтожать мосты, мельницы, а жителей со скотом переселять в леса".



# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Загад Карла XII прадугледжваў: "Кантрыбуцыю спаганяць агнём і мячом. Хутчэй хай пацерпіць невінаваты, чым выслізне вінаваты... Было б найлепей, каб усе гэтыя мясціны былі панішчаны рабункамі і пажарамі і каб усе, хто там жыве, вінаватыя ці невінаватыя, былі знішчаны".



# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Люты 1705 г.- рускае войска на чале з Аляксандрам Меньшыкавым падыйшло да Полацка.
- Чэрвень 1705 – у Полацк прыехаў Петр I. Тут ен выдаў маніфест, па якому забараніў шляхце збірацца на з’езды ці ехаць у Варшаву выбіраць новага караля.
- Полацкую Сафію апячаталі і зрабілі там вайсковы склад, дзе трымалі амуніцыю, а часам і коней. У скляпенні трымалі порах. 1 мая 1710 г. напярэдадні адступленню рускіх войск адбыўся выбух, які знішчыў сцяну, левы бакавы алтар, пашкодзіў калоны.

## Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- З сярэдзіны сакавіка да сярэдзіны мая 1710 г. у Магілеве быў Аляксандр Меньшыкаў. Члены Магілеўскага магістрата, якія не хацелі поўнага разбурэння горада, спрабавалі падарункамі схіліць Меньшыкава да літасці. Аднак царскі вельможа загадаў каб горад паставіў усе харчовыя прыпасы і фураж для рускай арміі.

# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- У ліпені 1708 г. Магілеў быў заняты войскамі Карла XII. Шведы, згодна запісам відавочцаў гараджан саджалі “у склепы, марылі голадам, у халодную ваду голых кідалі, на балках пад столлю падвешвалі”.
- Праз месяц шведы, прыхапіўшы 9 пудоў серабра, пакінулі горад.
- У верасні 1710 г. у горад зноў увайшлі рускія. Па загаду Пятра 8 верасня 1710 г. Магілеў быў зруйнаваны, хаця ваеннай патрэбы ў гэтым не было.

## Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- У час вайны жыхары Віцебска падтрымалі новага караля Станіслава Ляшчынскага, таемна паслалі сем тысяч талераў каралю. Даведаўшыся пра гэта Петр I загадаў падпаліць горад з чатырох бакоў.
- Асабліва пацярпелі ў вайне Гародня, Нясвіж, Клецк, Ляхавічы.

# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Па меры прасоўвання шведскай арміі на ўсход, Пётр адводзіў войска да сваёй мяжы, вымотваў праціўніка, падрываў яго баяздольнасць. Ён хацеў даць рашучы бой на беларускай зямлі.
- **28 верасня 1708 г. пад вёскай Лясная ля Прапойска (сучасны Слаўгарад) руская армія разграміла шведскі корпус генерала Левенгаўпта, які ішоў з Рыгі на дапамогу Карлу XII. Гэтую бітву Петр назваў «маці Палтаўскай баталіі».**





# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Разгром шведаў пад Палтавай (27 чэрвеня 1709 г.) рэзка памяняў палітычную сітуацыю ў краіне. Расійскае і польскае войскі ачысцілі ад шведаў і іх прыхільнікаў Беларусь, Жамойцію і Польшчу, ваенныя дзеянні перакінуліся на тэрыторыю Швецыі і ішлі далей пры поўнай перавазе Расіі.



Полтавская битва

# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў



- Трон Рэчы Паспалітай пры падтрымцы саксонскага войска зноў заняў Аўгуст II, прыхільнік цара Пятра, які разам з прускім каралём устанавіў над Рэччу Паспалітай палітычны кантроль.
- Шляхта, зняверaная ў былым манарху, усё ж пагадзілася аднавіць яго на пасадзе. Хоць межы Рэчы Паспалітай пасля Паўночнай вайны засталіся некранутымі, але яна **згубіла свой суверэнітэт і ўсё больш пападала ў залежнасць ад палітыкі расійскага манарха**.



# Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- У шэрагу гарадоў, у тым ліку ў Полацку і Быхаве, былі размешчаны расійскія гарнізоны. У Расію вывозіліся рамеснікі і моладзь. Царскі вяльможа А. Меншыкаў ад свайго імя раздаваў пасады і маёнткі прыхільнікам Пятра І.
- У 1717 г. Пётр І навязаў сойму Рэчы Паспалітай рашэнне аб скарачэнні яе войска і захаванні славутага "liberum veto".





## Вынікі Паўночнай вайны для беларусаў

- Вялікай цаной заплаціў беларускі народ у гэтай вайне. Агульныя страты насельніцтва склалі каля 30%, а гэта больш за 700 тыс. чалавек (за гады вайны яго колькасць знізілася з 2,2 млн. да 1,5 млн. чалавек).